# Культавыя іўдзейскія збудаванні

## Сінагогі і малітоўныя школы Магілёўскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя: тапаграфія і дынаміка колькасці

**Аналіз становішча іўдзейскіх культавых будынкаў Магілёўскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя паказвае, што ў рэгіёне знаходзілася больш за 80 населеных пунктаў з сінагогамі і малітоўнымі школамі. Найбольш тыповымі былі мястэчкі з 1–3 драўлянымі культавымі пабудовамі. На працягу 1859–1903 гадоў іх колькасць павялічылася на 40 %. Чаму ж адбыўся такі значны рост?**



**Канстанцін КАРПЕКІН, кандыдат гістарычных навук**

Асаблівасцю беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі было тое, што на іх тэрыторыі знаходзілася значная колькасць яўрэйскага насельніцтва, якое пераважна спавядала іўдаізм. У прыватнасці, у Віленскай губерні, па стане на 1860 год, пражывала 80 123 асобы (або 9 % насельніцтва губерні) *[1, с. 73]*. У 1862 годзе ў межах Гродзенскай губерні было 93 695 іўдзеяў, якія складалі 11 % насельніцтва гэтай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі *[2, с. 149]*, у Магілёўскай губерні – 123 243 іўдзеі (13 %) *[3, с. 71]*. Сярод жыхароў Віцебскай губерні ў тым жа годзе іўдзеяў было 63 168 чалавек (8 %) *[4, с. 204]*. На тэрыторыі Мінскай губерні ў 1863 годзе пражывала 97 830 прадстаўнікоў іўдзейскага веравызнання, што складала 10 % насельніцтва *[5, с. 12]*. Як відаць з прыведзеных звестак, найбольшая колькасць іўдзеяў пражывала ў Магілёўскай губерні (як паводле абсалютнай колькасці, так і паводле канцэнтрацыі). Пры гэтым асноўнымі месцамі пражывання яўрэяў былі гарады і мястэчкі. Дзяржаўная палітыка ў адносінах да прадстаўнікоў іўдзейскага веравызнання ў гэты час характарызавалася імкненнем не толькі кантраляваць дзейнасць абшчын, але і схіліць іх да пераходу ў праваслаўе *[6, с. 165–166, 202]*.

Неабходна адзначыць, што іўдзейская рэлігія прадугледжвала наяўнасць дзвюх асноўных разнавіднасцей культавых будынкаў: сінагог і малітоўных школ. Сінагога (на іўрыце – бет-кнесет, або дом сходу) была месцам грамадскага адпраўлення культу, цэнтрам рэлігійнага жыцця абшчыны, а таксама выкарыстоўвалася для абмеркавання ўсялякіх абшчынных спраў. У сваю чаргу, галоўным прызначэннем малітоўнай школы (бет-мідраш, ці дом вучэння) было вывучэнне Торы і іншых рэлігійных трактатаў.

**ПРА АЎТАРА**

КАРПЕКІН Канстанцін Рыгоравіч.

Нарадзіўся ў 1985 годзе ў в. Якубаўшчына Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў гістарычны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава (2007), аспірантуру НАН Беларусі (2012).

З 2007 года – старшы навуковы супрацоўнік аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў, з 2010 года – галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

Кандыдат гістарычных навук (2013).

Аўтар больш як 60 навуковых і 90 навукова-папулярных публікацый.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя іўдзейскіх абшчын Беларусі XIX–XX стагоддзяў, крыніцы па рэлігійнай гісторыі яўрэяў Беларусі XIX–XX стагоддзяў, гісторыя яўрэйскіх мястэчак Беларусі ў 1920–1930-я гады.

Асноўнымі нарматыўнымі актамі, якія рэгулявалі працэс узвядзення іўдзейскіх культавых будынкаў у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя, былі Палажэнне пра яўрэяў ад 13 красавіка 1835 года, а таксама Статут будаўнічы 1857 і 1900 гадоў.

Так, згодна з Палажэннем пра яўрэяў 1835 года, малітоўныя сходы вернікаў маглі ажыццяўляцца толькі ў сінагогах і малітоўных школах, якія будаваліся выключна з дазволу губернскага кіраўніцтва (а на прыватнаўласніцкай тэрыторыі патрабаваўся яшчэ дазвол уладальніка). Для таго, каб будаўніцтва было адобрана, неабходна было выканаць шэраг умоў.

Па-першае, іўдзейскім культавым збудаванням належала знаходзіцца на значнай адлегласці ад хрысціянскіх храмаў. Па-другое, праект будаўніцтва трэба было зацвердзіць у кіраўніцтва. Па-трэцяе, у населеных пунктах, дзе колькасць яўрэйскіх двароў не перавышала 30, дазвалялася мець адну малітоўную школу; дзе налічвалася не больш за 80 двароў, акрамя школы, магчыма было ўзвесці адну сінагогу; нарэшце, у гарадах і мястэчках, дзе колькасць яўрэйскіх сем'яў перасягала 80, вернікі мелі права будаваць адну школу на кожныя 30 двароў альбо адну сінагогу на кожныя 80 двароў. Згаданыя разлікі не распаўсюджваліся на малітоўныя будынкі, узведзеныя з дазволу губернскіх улад да 1835 года. Новыя сінагогі і школы, збудаваныя насуперак гэтым правілам, альбо разбураліся, альбо аднаўляліся за кошт людзей, якія падтрымлівалі абшчыну *[7, с. 318]*.

У Статуце будаўнічым 1857 і 1900 гадоў былі змешчаны аналагічныя правілы. Адначасова ў дакуменце ўдакладнялася мінімальная адлегласць, якая павінна быць паміж іўдзейскімі і праваслаўнымі малітоўнымі будынкамі: 100 сажняў, калі яны знаходзіліся на адной плошчы ці вуліцы, і 50 – калі яны размяшчаліся на розных вуліцах *[8, с. 57–58; 9, с. 227]*.

Усяго ў 1860 годзе на тэрыторыі Магілёўскай губерні налічвалася 86 населеных пунктаў з сінагогамі і малітоўнымі школамі: 13 гарадоў і 73 мястэчкі. У іх знаходзіўся 271 іўдзейскі культавы будынак.

Найбольш тыповым для рэгіёна было мястэчка з адным іўдзейскім культавым будынкам (40, альбо 46,5 % ад агульнай колькасці населеных пунктаў). На другім месцы – населеныя пункты з трыма малітоўнымі збудаваннямі: 17 паселішчаў, альбо 19,8 %. Таксама распаўсюджанымі ў Магілёўскай губерні былі мястэчкі з дзвюма малітоўнямі. У межах рэгіёна іх было 11, што складала 12,8 %. Гарады і мястэчкі з колькасцю 4 і больш іўдзейскіх культавых будынкаў сустракаліся зусім рэдка. У прыватнасці, па 4 малітоўні функцыянавала ў 5 населеных пунктах (5,8 %), па 5 – у 4 (4,7 %), па 7 – у 3 (3,5 %). Нарэшце, у межах даследуемай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі было толькі па аднаму населенаму пункту з 6, 9, 10, 14, 24 і 34 сінагогамі і малітоўнымі школамі *[10, с. 6, 12, 14–20, 23, 24, 26, 28, 29, 31–42, 44–48, 50–52, 57–62, 66, 69, 71–79, 82–86, 88, 89, 91, 92, 94, 95, 97–100, 102, 104, 105, 107]*.

Калі аналізаваць наяўнасць тых ці іншых відаў іўдзейскіх малітоўняў, то варта заўважыць, што ў 57 населеных пунктах (66,3 %) дзейнічалі выключна малітоўныя школы. Праўда, у рэгіёне было 3 мястэчкі (3,5 %), у якіх усе іўдзейскія культавыя будынкі з'яўляліся сінагогамі. У 23 населеных пунктах Магілёўскай губерні (26,7 %) мелася па адной сінагозе, а астатнія культавыя будынкі – малітоўныя школы. Адзінкавымі былі гарады з 2 і 3 сінагогамі (адпаведна – 2,3 і 1,2 %), астатнія ж культавыя збудаванні мелі статус малітоўных школ *[10, с. 6, 12, 14–20, 23, 24, 26, 28, 29, 31–42, 44–48, 50–52, 57–62, 66, 69, 71–79, 82–86, 88, 89, 91, 92, 94, 95, 97–100, 102, 104, 105, 107]*.

Пераважная большасць іўдзейскіх культавых будынкаў Магілёўскай губерні, паводле даных на 1860 год, была ўзведзена з дрэва. Муравнымі з'яўляліся толькі 5 сінагог і 11 малітоўных школ (альбо 5,9 % ад агульнай колькасці). Па ліку цагляных малітоўных збудаванняў лідзіруе губернскі горад Магілёў: тут дзейнічалі адна мураваная сінагога і 9 малітоўных школ. На другім месцы знаходзіўся Стары Быхаў, дзе мелася дзве мураваныя малітоўні: сінагога і малітоўная школа.

| Месцазнаходжанне іўдзейскіх культавых будынкаў | Колькасць | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1859 год | 1860 год | 1862 год | 1889 год | 1903 год |
| Гомель (з Беліцай) | 7 | 7 | 12 | 21 | 28 |
| Гомельскі павет | 7 | 8 | 8 | 15 | 18 |
| Горкі | – | 4 | – | 5 | 6 |
| Горацкі павет (існаваў з 1861 г.) | – | – | – | 30 | 29 |
| Клімавічы | 2 | 2 | 2 | 5 | 5 |
| Клімавіцкі павет | 18 | 18 | 17 | 18 | 20 |
| Копысь | 3 | 3 | 3 | 3 | 4 |
| Копыскі павет (існаваў да 1861 г.) | 16 | 16 | – | – | – |
| Магілёў | 33 | 34 | 36 | 38 | 54 |
| Магілёўскі павет | 37 | 38 | 42 | 35 | 38 |
| Мсціслаў | 7 | 7 | 8 | 10 | 11 |
| Мсціслаўскі павет | 22 | 14 | 18 | 16 | 23 |
| Орша | 7 | 7 | 9 | 12 | 15 |
| Аршанскі павет | 39 | 38 | 40 | 29 | 29 |
| Рагачоў | 6 | 6 | 6 | 8 | 9 |
| Рагачоўскі павет | 15 | 14 | 16 | 18 | 18 |
| Стары Быхаў | 10 | 10 | 11 | 8 | 11 |
| Быхаўскі павет | 11 | 10 | 13 | 13 | 16 |
| Сянно | 5 | 5 | 6 | 6 | 6 |
| Сенненскі павет | 3 | 5 | 5 | 12 | 18 |
| Чавусы | 9 | 9 | 9 | 9 | 7 |
| Чавускі павет | 10 | 8 | 8 | 9 | 14 |
| Чэрыкаў | 5 | 5 | 5 | 6 | 6 |
| Чэрыкаўскі павет | 6 | 7 | 6 | 9 | 8 |
| Усяго па губерні | 278 | 271 | 302 | 340 | 392 |

**Табліца 1. Дынаміка колькасці іўдзейскіх культавых будынкаў у Магілёўскай губерні ў 1859–1903 гадах**
Крыніца: распрацоўка аўтара.

Па адной мураванай сінагозе функцыянавала ў Гомелі і Чэрыкаве, адна школа – у Оршы. Апроч таго, у Магілёўскай губерні існавала толькі адно мястэчка з мураванай малітоўнай школай – Шклоў *[10, с. 6, 12, 23, 31, 66, 102]*.

На працягу другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя колькасць іўдзейскіх малітоўных будынкаў паступова павялічвалася (табл. 1).

Неабходна адзначыць, што ў крыніцах даюцца розныя статыстычныя звесткі. У прыватнасці, у ведамасці пра колькасць яўрэяў, сінагог, малітоўных школ і службовых асоб за 1859 год па Магілёўскай губерні ёсць інфармацыя, якая супярэчыць Памятным кніжкам Магілёўскай губерні, на аснове якіх складзена прыведзеная вышэй табліца. А менавіта: у ведамасці пазначана, як правіла, большая колькасць малітоўных будынкаў (у Быхаўскім павеце – 12, у Гомелі – 8, у Копыскім павеце – 23, у Магілёве – 34, у Магілёўскім павеце – 44, у Сянне – 6, у Сенненскім павеце – 5, у Чавускім павеце – 11). Менш малітоўняў значыцца ў Клімавіцкім і ў Мсціслаўскім паветах – 16 і 19 адпаведна, у Рагачове – 5. Агульная колькасць сінагог і малітоўных школ па губерні, згодна з данымі ведамасці, у выніку атрымліваецца значна большай – 296 будынкаў *[11, арк. 60]*.

Што датычыцца дынамікі колькасці іўдзейскіх малітоўных будынкаў, то на працягу 1859–1860 гадоў у губерні назіралася іх пэўнае скарачэнне (у прыватнасці, па Мсціслаўскім, Рагачоўскім, Чавускім паветах). Дакладныя прычыны гэтай з’явы ўстанавіць не ўдалося, але верагодна, што гэта магло стаць вынікам як



**Малюнак 1. Праект будаўніцтва драўлянай малітоўнай школы «Мішнаес» у м. Татарск Мсціслаўскага павета. 1892 год**
Крыніца: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

наўмыснага закрыцця, так і пажараў, якія часта здараліся ў населеных пунктах з драўлянай забудовай.

Пачынаючы з 1861–1862 гадоў у межах губерні праявілася тэндэнцыя да росту колькасці іўдзейскіх культавых будынкаў. Фактычна гэта быў перыяд самага інтэнсіўнага будаўніцтва: за два гады ўзнікла 31 малітоўня. Надалей працэс значна запаволіўся: за 1863–1889 гады было пабудавана толькі 38 сінагог і малітоўных школ. Затое з 1890-х гадоў будаўніцтва зноў актывізавалася (за 14 гадоў колькасць малітоўных будынкаў у Магілёўскай губерні павялічылася на 52, гэта значыць амаль па 4 штогод). Найбольш хутка гэта адбывалася ў Гомелі, Магілёве, Оршы. Такую з'яву ў першую чаргу варта звязваць з павелічэннем колькасці іўдзейскага насельніцтва ў рэгіёне.

Разам з тым нельга не адзначыць факты змяншэння колькасці сінагог і малітоўных школ у межах некаторых паветаў і павятовых цэнтраў у пэўныя перыяды. Гэта датычыцца Старога Быхава, Магілёўскага і Мсціслаўскага паветаў у 1862–1889 гадах, Горацкага і Чэрыкаўскага паветаў, Чавусаў у 1889–1903 гадах. Там прычынамі маглі быць ужо названыя вышэй закрыццё і пажары. А вось значнае скарачэнне малітоўных будынкаў у Аршанскім павеце пасля 1862 года тлумачыцца зменамі ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле губерні: у 1861 годзе быў утвораны Горацкі павет, да якога была далучана частка Аршанскага. Пры гэтым атрымліваецца, што ў Памятных кніжках інфармацыя падавалася з некаторым спазненнем.

Такім чынам, у 1859 годзе ў Магілёўскай губерні мелася 278 іўдзейскіх культавых будынкаў: 31 сінагога (4 мураваныя і 27 драўляных) і 247 малітоўных школ (15 мураваных і 232 драўляныя). Да 1903 года іх стала 392: колькасць сінагог зменшылася да 18 (5 мураваных і 13 драўляных), а малітоўных школ узрасла да 374 (43 мураваныя і 331 драўляная) *[10, с. 92; 12, с. CXXI]*. Іншымі словамі, як і раней, асноўнай катэгорыяй культавых будынкаў заставаліся драўляныя малітоўныя школы.



**Малюнак 2. Незацверджаны праект узвядзення «Цэхавай школы» ў Мсціславе. 1898 год**
Крыніца: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

Зразумела, ініцыятыва будаўніцтва новых культавых будынкаў зыходзіла ад членаў іўдзейскіх абшчын. Так, напрыклад, у 1860-я гады актыўна вялося будаўніцтва малітоўных школ у Сянне (у 1863 годзе ўзведзена Старасельская школа, у 1864 – Любавіцкая, у 1865 – Рамесніцкая, у 1867 – Міснагідская) *[13, арк. 25 адв. – 26]*. Параўноўваючы колькасць школ са статыстычнымі звесткамі, прыведзенымі ў табліцы, можна меркаваць, што гэта было хутчэй аднаўленне пасля пажару, чым узвядзенне новых будынкаў.

У 1870-я гады павялічылася колькасць іўдзейскіх малітоўняў на тэрыторыі Аршанскага павета. У прыватнасці, у 1875 годзе пабудавана Аўраамаўская сінагога ў Лёзне, у 1877 – Вялікая сінагога ў Бабінавічах *[13, арк. 19, 22]*.

У 1883 годзе ў Магілёўскае губернскае праўленне было пададзена хадайніцтва аб узвядзенні новай малітоўнай школы ў Жлобіне. Дазвол вернікі не атрымалі, паколькі план будаўніцтва не адпавядаў патрабаваным нормам *[14, арк. 1–2]*. У тым жа годзе яўрэі-вернікі Мсціслава спрабавалі зацвердзіць планы будаўніцтва 8 малітоўных школ, але на згаданых дакументах не былі абазначаны суседнія пабудовы, што і стала нагодай для адмовы з боку праўлення *[15, арк. 1–4]*.

У 1884 годзе іўдзейская абшчына Горак таксама абрала тактыку аднachасовай падачы некалькіх заяў у будаўнічае аддзяленне губернскага праўлення. Вернікі планавалі аднавіць адну школу пасля пажару і пабудаваць дзве новыя. Пасля таго як у красавіку чарцяжы былі зацверджаны, у чэрвені ад абшчын паступілі просьбы аб іх карэкціроўцы. Меркавалася адну школу зрабіць больш высокай, каб яна вылучалася сярод навакольных жылых будынкаў, а другую ўзвесці на мураваным падмурку, а не на драўляным, як прадугледжвалася першапачаткова. Варта адзначыць, што гэтыя выпраўленні былі адобраны губернскімі ўладамі *[16, арк. 1–3, 6–10]*.

Дзейнасць іўдзейскай абшчыны Магілёва таксама была дастаткова паспяховай: у лістападзе 1892 года яна атрымала дазвол на перабудову адной драўлянай малітоўнай школы ў мураваную *[17, арк. 1–2]*. У наступным 1893 годзе была

ўзведзена новая малітоўная школа ў Татарску *[18, арк. 1, 4]*.

У 1898 годзе новыя спробы ўзвядзення культавых будынкаў ажыццявілі іўдзеі Мсціслава. Так, у сакавіку імі быў складзены праект аднаўлення пасля пажару драўлянай «Цэхавай школы». Праўда, зацверджаны ён не быў, бо паміж суседнімі будынкамі мелася недапушчальна малая адлегласць *[19, арк. 1, 4]*. Не адразу вернікі атрымалі дазвол на пабудову мураванай малітоўнай школы «Васікін» замест згарэлай драўлянай. Першапачаткова будаўнічае аддзяленне Магілёўскага губернскага праўлення забараніла аднаўленне малітоўні, але ўжо праз месяц – у маі 1898 года – перагледзела сваё рашэнне *[20, арк. 1, 2, 4]*. Тады ж іўдзеі Мсціслава атрымалі дазвол на будаўніцтва адной новай малітоўнай школы *[21, арк. 2]*.

Разам з тым неабходна адзначыць, што ў межах Магілёўскай губерні меліся населеныя пункты, у якіх на працягу другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя колькасць іўдзейскіх культавых будынкаў зусім не змянялася. У першую чаргу такая з'ява была характэрна для невялікіх мястэчак з адной малітоўнай школай. Прыкладамі могуць служыць Друцк, Княжычы, Цяцерын Магілёўскага павета, Хальч Гомельскага павета, Коханава Копыскага павета, Раманава, Расасна Аршанскага павета, Свержань Рагачоўскага павета, Лукомль Сенненскага павета, Горы Чавускага павета і інш. *[10, с. 14, 18, 19, 34, 48, 72, 74, 86, 94, 99; 11, арк. 50; 22, с. 264, 268, 272–274, 340, 348, 414]*.

З прыведзеных вышэй фактаў вынікае, што сінагогі і малітоўныя школы – яўная прыкмета пражывання ў горадзе ці мястэчку прадстаўнікоў іўдзейскага веравызнання. У Магілёўскай губерні налічвалася больш за 80 такіх населеных пунктаў, пры гэтым найбольш тыповымі для названага рэгіёна былі мястэчкі з 1–3 драўлянымі малітоўнымі будынкамі (яны складалі 80 % ад агульнай колькасці паселішчаў). Нягледзячы на тое, што ў межах некаторых асобна ўзятых паветаў назіралася скарачэнне сінагог і малітоўных школ, у цэлым па Магілёўскай губерні на працягу 1859–1903 гадоў колькасць іўдзейскіх малітоўняў павялічылася да 392 (узрасла прыкладна на 40 %). Ініцыятыва будаўніцтва новых культавых будынкаў зыходзіла выключна ад членаў яўрэйскіх рэлігійных абшчын, якія мелі патрэбу як у аднаўленні культавых будынкаў (у прыватнасці, пасля пажараў), так і ў павелічэнні іх колькасці ў сувязі з ростам яўрэйскага насельніцтва.

## ЛІТАРАТУРА


1. Памятная книжка Виленской губернии на 1861 год. Ч. 2. Сборник статей исторического и статистического содержания, изданный Виленским губернским статистическим комитетом. – Вильно: Типография А. Сыркина, 1861. – [6], 205 с.
2. Памятная книжка Гродненской губернии. На 1864 год, составленная в Гродненском статистическом комитете. – Гродно: Гродненская губернская типография, [1864]. – 160 с.
3. Памятная книжка Могилевской губернии, изданная Могилевским губернским статистическим комитетом. На 1863 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1862. – 236, 104, XI с.
4. Памятная книжка Витебской губернии на 1864 год. – СПб: типография К. Вульфа, 1864. – VIII, 415 с.
5. Памятная книжка Минской губернии на 1865 год. – Минск: Губернская типография, 1864. – [3], 8, [5], 232, 55 [2] с.
6. Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В.В. Яноўская [і інш.]; навук. рэд. В.В. Яноўская. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – 496 с.
7. Полное собрание законов Российской Империи. Собрание Второе. Том X. Отделение 1. 1835 г. – СПб: Типография II Отделения Собственной Е.И.В. Канцелярии, 1836. – 918 с.
8. Свод законов Российской Империи. Издание 1857 года. – СПб: Типография II Отделения Собственной Е.И.В. Канцелярии, 1857. – 664 с. – Т. 12, ч. 1.
9. Свод Законов Российской Империи. Издание 1900 года. – СПб: Типография II Отделения Собственной Е.И.В. Канцелярии, 1900. – 519, XIV, XII с. – Т. 12, ч. 1.
10. Памятная книжка Могилевской губернии, на 1861 г., изданная Могилевским губернским правлением. – Могилев: типография Губернского правления, 1861. – 465 с.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд. 2001. Воп. 1. Спр. 742.
12. Адрес-календарь и памятная книжка Могилевской губернии на 1905 год. – Могилев губернский: типография Я.Н. Подземского, 1905. – [2], 51, LXXX, 353, CC, 50 с.
13. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд. 2356. Воп. 1. Спр. 31.
14. НГАБ. – Ф. 3363. Воп. 1. Спр. 177.
15. НГАБ. – Ф. 3363. Воп. 1. Спр. 179.
16. НГАБ. – Ф. 3363. Воп. 1. Спр. 197.
17. НГАБ. – Ф. 3363. Воп. 1. Спр. 319.
18. НГАБ. – Ф. 3363. Воп. 1. Спр. 330.
19. НГАБ. – Ф. 3363. Воп. 1. Спр. 510.
20. НГАБ. – Ф. 3363. Воп. 1. Спр. 517.
21. НГАБ. – Ф. 3363. Воп. 1. Спр. 539.
22. Верхнее Поднепровье и Белоруссия. Полное географическое описание нашего Отечества / сост. В.П. Семенов (Тян-Шанский) [и др.]. – Минск: БелЭН, 2006. – 456 с.